# ВДУ: ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

Па традыцыі напрыканцы чэрвеня – у пачатку ліпеня выпускнікі нашага ўніверсітэта атрымалі дыпломы аб вышэйшай адукацыі. Сёлета маладых спецыялістаў было больш, чым звычайна, бо выпускаліся адразу два курсы – з пяцігадовым і чатырохгадовым тэрмінамі навучання. На дзённай форме атрымання адукацыі дыпломы былі ўручаны 1304 выпускнікам, на завочнай – 871.

***

Студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі нашай ВНУ прынялі ўдзел у рабоце экспертна-медыйнага семінара ў рамках Дня Саюзнай дзяржавы на міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Эксперты, сярод якіх былі дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Р.А. Рапота, міністр культуры Рэспублікі Беларусь Б.У. Святлоў, вядомыя пісьменнікі, грамадскія дзеячы, мастакі, абмеркавалі актуальныя пытанні мастацкай і літаратурнай спадчыны, ролю мастацтва ў развіцці культурнай прасторы Беларусі і Расіі і інш.

***

У трэці раз на базе нашага ўніверсітэта адкрылася «Летняя школа» для студэнтаў і выкладчыкаў Пекінскага аб'яднанага ўніверсітэта і Пекінскага ўніверсітэта. На працягу двух тыдняў трыццаць удзельнікаў вывучалі рускую мову, знаёміліся з нашай ВНУ, Віцебскам, яго славутасцямі і гісторыяй. Акрамя таго, для гасцей з Кітая была запланавана экскурсія па маршруце «Мір – Нясвіж».

Напрыканцы навучання ўсе ўдзельнікі атрымалі сертыфікаты аб праходжанні «Летняй школы».

***

На пачатку ліпеня для праходжання летняй практыкі (пленэру) на мастацка-графічны факультэт нашага ўніверсітэта прыехалі студэнты Наўгародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Мудрага. Госці займаліся напісаннем эцюдаў з натуры. Асноўная тэма іх работ – прыгожыя месцы Віцебска. Для гасцей была арганізавана цікавая экскурсія па горадзе. Ад імя ўсіх студэнтаў кіраўнік наўгародскай групы Дар'я Сакалова падзякавала куратарам – дэкану мастацка-графічнага факультэта Ю.П. Бежанар і аспіранту кафедры выяўленчага мастацтва Дзмітрыю Фурыку, а таксама дацэнту гэтай жа кафедры Г.П. Ісакаву, які праводзіў экскурсію па Віцебску.

***

Студэнты і выкладчыкі мастацка-графічнага факультэта падчас фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» ў «Горадзе майстроў» прапаноўвалі набыць вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і намаляваць прыгожы партрэт ці арыгінальную карыкатуру, а студэнты гістарычнага факультэта ў рамках экскурсійна-вытворчай практыкі праводзілі для жыхароў і гасцей горада бясплатныя экскурсіі па Віцебску.

**Падрыхтавала Анастасія БАЛТОЎСКАЯ, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.**